Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (109), 2018

*УДК 94(476):94(474.5)):94(470):94(476+474.5)"16"*

# Літва і Русь вачыма жыхароў ВКЛ XVII ст.

С.А. Чаропка

Адной з праблем пры вывучэнні гісторыі Беларусі XVII ст., а таксама яго адлюстравання для сучаснага грамадства з'яўляецца праблема тэрміналогіі. У гэтым кантэксце асабліва няпростым з'яўляецца разуменне этнонімаў і геаграфічных назваў таго часу. У прадстаўленым артыкуле вывучаецца разуменне значэння шэрагу харонімаў жыхарамі Вялікага княства Літоўскага ў XVII ст. і робіцца спроба геаграфічнай прывязкі гэтых гістарычных абласцей да сучасных тэрыторый.
**Ключавыя словы:** Русь, Белая Русь, Літва, Палессе, Север.

One of the major problems in the study of the history of Belarus of the XVII century, as well as displaying it for the modern society is the problem of terminology. In this context it is particularly difficult to understand the ethnonyms and place names of that time. In the present paper the author studies the understanding of the importance of a number of horonima by the residents of the Grand Duchy of Lithuania in the XVII century and attempts to geo-referencing of historical areas to modern areas.
**Keywords:** Rus, Belaya (White) Rus, Litva (Lithuania), Polesye, Sever.

Гісторыя Беларусі ранняга новага часу з'яўляецца адным з вельмі цікавых, але, разам з тым, і вельмі няпростых перыядаў для даследчыкаў. У гэты перыяд адбываюцца глыбокія змены ў эканамічным, палітычным, міжнародным, культурным жыцці Вялікага княства Літоўскага, якія істотна паўплывалі на этнічныя працэсы ў краіне ў цэлым і беларускім грамадстве ў прыватнасці. Адной з істотных праблем пры вывучэнні гэтага перыяду, а таксама яго далейшага адлюстравання для сучаснага грамадства з'яўляецца праблема тэрміналогіі, перш за ўсё разумення і перадачы этнонімаў і геаграфічных назваў. У прадстаўленым артыкуле вывучаецца разуменне значэння шэрагу харонімаў жыхарамі ВКЛ XVII ст. і робіцца спроба геаграфічнай прывязкі гэтых гістарычных абласцей да сучасных тэрыторый.

Зыходзячы з прынцыпу гістарызму, які ўлічвае не толькі сучаснае разуменне канкрэтнай гістарычнай з'явы, а ўлічвае спецыфіку яго развіцця ў канкрэтны гістарычны перыяд, у прадстаўленым артыкуле падаецца правільным выкарыстоўваць існуючыя ў сярэдзіне XVII ст. этнонімы «рускі», для азначэння прадстаўнікоў той часткі жыхароў ВКЛ, якія вызнавалі ўсходні варыянт хрысціянства ў незалежнасці ад таго ці прынялі яны царкоўную ўнію 1596 г. або не, якія сталі ў наступным асновай для фарміравання беларускай нацыі. Пры гэтым адзначым асобна, што да гэтага часу ўжо існаваў іншы народ, які выкарыстоўваў той жа этнонім і здолеў у далейшым яго замацаваць выключна за сабою. Тэрмін «літоўскі» ў прадстаўленым даследаванні выкарыстоўваецца як для абазначэння каталіцкага, пераважна балтамоўнага насельніцтва ВКЛ, а таксама як абагульняючы тэрмін для ўсіх жыхароў і тэрыторыі дзяржавы, якая яшчэ ў познім сярэднявеччы аб'яднала ў сваіх межах продкаў беларусаў і літоўцаў.

Да сярэдзіне XVII ст. Вялікае княства Літоўскае ўжо амаль сто гадоў як з'яўлялася складовай часткай Рэчы Паспалітай. Люблінская ўнія 1569 г. завяршыла працэс палітычнай інтэграцыі ВКЛ з Польшчай, які распачаўся яшчэ ў XIV ст. За час сумеснага жыцця ў Рэчы Паспалітай у ВКЛ адбыліся істотныя змены, якія зблізілі польскую і літоўска-рускую мадэлі дзяржаўнасці, спрыялі распаўсюджванню ў літоўскім і рускім грамадстве польскіх культурных узораў і рэлігійных трэндаў. Эканамічная, палітычная і культурная перавага Польскага каралеўства ў новай краіне, апрача іншага, яскрава праявілася ў паступовай эвалюцыі назвы самой дзяржавы. Артыкул першы Люблінскай уніі ўжывае тэрмін Рэч Паспалітая абодвух народаў, не выключаючы пры гэтым афіцыйных назваў – Карона Польская і Вялікае княства Літоўскае [1], [2], [3]. У міжнародных дагаворах і дыпламатычных трактатах другой палове XVI ст. Рэч Паспалітая называлася пераважна як Regnum Poloniae Magnusque Ducatus Lithuania, г. зн. Каралеўства Польскае і Вялікае княства Літоўскае. Але ўжо з пачатку XVII ст. у крыніцах усё часцей сустракаецца азначэнне Res

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Publica, Res Publica Poloniae або Rzeczpospolita Polska – Рэч Паспалітая Польская. У паўсядзённай мове жыхары гэтай дзяржавы выкарыстоўвалі тэрмін «Рэч Паспалітая» або «Польшча» [4, с. 61–69]. Пад Польшчай у шырокім сэнсе стала разумецца не толькі Польскае каралеўства, але ўся Рэч Паспалітая, у тым ліку і яе літоўская частка. У сувязі з двузначнасцю тэрміна Польшча, для азначэння менавіта Польскага каралеўства стаў дамініраваць тэрмін ***«Карона»***.

Вельмі няпростым пытаннем да сённяшняга дня з'яўляецца разуменне сучаснікамі шэрагу гісторыка-геаграфічных тэрмінаў, сярод якіх, напэўна, найбольш дыскусійнымі з'яўляюцца паняцці «Літва» і «Русь». Яшчэ ў XIII–XIV ст. літоўскія манархі, пашыраючы сваю дзяржаву за кошт старажытнарускай спадчыны, абвясцілі сябе гаспадарамі не асобных рускіх княстваў, а ўсіх рускіх земель. Гедымін і Вітаўт лічылі сябе каралямі *«літоўцаў і рускіх», «Літвы і Русі»*, імкнучыся замацаваць за сваёй краінай імідж спадкаемцы Старажытнарускай дзяржавы.

Але ў канцы XV–XVI ст. ва Усходняй Еўропе адбыліся сур'ёзныя геапалітычныя змены. У сярэдзіне XVI ст. з прыняццем маскоўскім князем Іванам Грозным царскага тытула адбываецца канчатковая трансфармацыя Вялікага княства Маскоўскага ў ***Рускае царства***. У той жа час пасля заключэння Люблінскай уніі і стварэння Рэчы Паспалітай ў прыватнай дакументацыі і афіцыйным справаводстве Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае губляе дадатковыя тэрытарыяльныя азначэнні і называецца ў спрошчаным выглядзе Вялікім княствам Літоўскім, Літвой або часта падаецца ў выглядзе скарачэння WXL, WKsL (ВКЛ). Унутрыпалітычныя праблемы спачатку ВКЛ, а затым і Рэчы Паспалітай, цесна звязаныя з этнаканфесійным супрацьстаяннем актыўна выкарыстоўвала кіраўніцтва Рускага царства прэтэндуючы на права валодаць усёй Руссю. У сувязі з гэтым правячыя колы Рэчы Паспалітай не жадалі прызнаваць за ўсходнім суседам не толькі царскі тытул, але і яго права на ўсе рускія землі, а з гэтага вынікае, што яны не маглі пагадзіцца не толькі з новым статусам, але і з новай назвай былой Маскоўскай дзяржавы. Для жыхара Рэчы Паспалітай XVII ст. за ўсходняй мяжой знаходзілася не Русь, а Масковія або Масква. Напрыклад, вядомы літоўскі дзяржаўны і ваенны дзеяч Ф.К. Абуховіч выкарыстоўвае гэты тэрмін, маючы на ўвазе не горад, а ўсю дзяржаву, ужывае звароты *«цар маскоўскі… граніца маскоўская… Крым з Масквой»* [5, с. 23, 25, 33, 35]. Такіх прыкладаў вялікая колькасць. Такім чынам, калі для жыхара Рускай дзяржавы Руссю або Русіяй (менавіта гэты тэрмін можна сустрэць у манаршых тытулах Івана Грознага, Міхаіла Фёдаравіча, Аляксея Міхайлавіча) была яго краіна, то для жыхара Рэчы Паспалітай Русь знаходзілася ў межах польска-літоўскай федэрацыі, а вось за ўсходняй яе мяжой знаходзілася Масковія.

У кантэксце існавання двух варыянтаў Русі, зыходзячы з экспансіянісцкай знешняй палітыкі Рускай дзяржавы, важную ролю адыграваў рэлігійна-адміністрацыйны падзел Русі на Малую і Вялікую Русь. Тэрмін ***Малая Русь*** узнік у Візантыі яшчэ ў XIV ст., калі паміж літоўскімі і маскоўскімі князямі пачалася барацьба за ўплыў на кіеўскага мітрапаліта. Гэты працэс, які расцягнуўся больш на стагоддзе, прывёў да падзелу Кіеўскай мітраполіі на дзве часткі – Кіеўскую і Маскоўскую. У тэрміналогіі канстанцінопальскіх патрыярхаў з'явілася Малая Русь (Μικρά Ῥωσία), якая аб'яднала праваслаўныя епархіі ВКЛ і Польшчы, і ***Вялікая Русь*** (Μεγάλη Ῥωσία), што ўключыла ў сябе епархіі Вялікага княства Маскоўскага і залежных ад яго рускіх княстваў. У першай палове XVII ст. тэрмін Малая Русь захаваў рэлігійнае адценне і часта сустракаецца ў палемічнай літаратуры антыўніяцкай скіраванасці [6, с.28], [7, с. 799], [8, с. 18].

У межах ВКЛ новачасныя крыніцы трывала выдзяляюць тры рэгіёны: «Літву», «Русь» і «Жмудзь» (Жэмайцію). У канцы XX – пачатку XXI ст. у беларускай гістарыяграфіі разгарэлася дыскусія адносна канкрэтнага геаграфічнага значэння гэтых тэрмінаў. Так, на думку М. Ермаловіча, у XVI ст. тэрмін «Літва» азначаў тэрыторыю сучаснай Беларусі і ўсходняй часткі Літоўскай Рэспублікі. Руссю, лічыць даследчык, з'яўлялася тая частка сучаснай Украіны, якая ўваходзіла ў склад ВКЛ [9, с. 57]. Аднак такое разуменне тэрмінаў «Літва» і «Русь» падаецца вельмі спрошчаным.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У XVI–XVII ст. у геаграфічным сэнсе тэрмін «***Літва***» ўжываўся сучаснікамі перш за ўсё як палітонім для абазначэння ўсяго Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, так і як харонім для выдзялення сучасных цэнтральнай і заходняй частак Рэспублікі Беларусь, а таксама ўсходняй часткі Літоўскай Рэспублікі. Напрыклад, як палітонім разумее тэрмін Літва ўжо згаданы вышэй Ф.К. Абуховіч, які піша: «*У той час у Літве ў нас агонь гультайскімі Хмяльніцкага купамі запушчаны, так далёк дайшоў, што паветы Старадуб, Рэчыца, Мазыр, Пінск, Брэсць і іншых замкаў немала на Белай Русі да шчэнту знішчаны*» [5, с. 20]. У паказаным прыкладзе сучаснік пад Літвой разумее ўсю дзяржаву, як і ў наступным –«*гетмана ані з Літвы, ані з Кароны не было*» [5, с. 23]. У рэгіянальным сэнсе да Літвы належалі Віленскі, Вількамірскі, Ковенскі, Трокскі, Упіцкі, Браслаўскі, Ваўкавыскі, Гарадзенскі, Лідскі, амаль цалкам Ашмянскі і Слонімскі паветы, большая частка Навагрудскага і заходняя частка Менскага паветаў [10, с. 206]. У 1623 г. у скарзе дызуніцкай шляхты на сойме сярод гарадоў Літвы ў рэгіянальным сэнсе адносіліся Вільня, Менск, Новагародак, Гародня, Слонім, Берасце, Браслаў, Кобрын, Камянец [11, с. 102]. Варта пагадзіцца з меркаваннем В.Л. Насевіча, што мяжой паміж Літвой і Руссю да канца XVI ст. была умоўная лінія Браслаў-Лагойск-Петрыкаў [12, с. 124–125]. Пры гэтым сам тэрмін «Літва» паступова пашыраўся на ўсход. Калі яшчэ ў XIV ст. для разумення сучаснікаў Менск быў Руссю, то для сучаснікаў XVI–XVII ст. Менск быў ужо ў Літве. На ўсход ад Менска пачыналася Русь [13, с. 45–48].

Паняцце «***Русь***» у Рэчы Паспалітай сярэдзіны XVII ст. з’яўлялася яшчэ больш шматпланавым. У шырокім сэнсе гэты тэрмін выкарыстоўваўся сучаснікамі для абазначэння той часткі тэрыторыі сучаснай Украіны, якая ўваходзіла ў склад Польскага каралеўства, а таксама ўсходняй і паўднёвай частак Беларусі. Гэта значыць, што ў гэтым разуменні Русь – гэта пэўны гістарычны арэал у межах далюблінскага ВКЛ, які не меў канкрэтных адміністратыўных межаў [14, с. 16–17]. Люблінская ўнія 1569 г. падзяліла рускія землі на фактычна каронную Русь і літоўскую Русь.

Папскі нунцый Ян Торэс падзяляе Русь на тры часткі: «*Чырвоная Русь з гарадамі Львовам, Перамышлем, да якой належыць Валынь; Белая Русь, якая працягнулася ад Рыгі, сталіцы Ліфляндыі, да маскоўскай мяжы, уключаючы Полацк, Оршу, Віцебск, Магілёў; Чорная Русь, якая знаходзілася паміж Літвой і Валынню, да Кіева з гарадамі Пінскам, Навагрудкам, Оўручам…*» [15]. Аднак ў дыярыушах і мемуарных крыніцах, дзе адлюстравана непасрэднае ўспрыманне навакольнай рэальнасці, узгадваецца пераважна толькі Белая Русь (або Russia Alba), у той час калі іншыя «каляровыя» формы Русі практычна адсутнічаюць [16, с. 75], [17, с. 2, 6].

Беларускі гісторык і этнограф М.Ф. Піліпенка разумее тэрмін «***Белая Русь***» у шырокім сэнсе як этнічную тэрыторыю, на якой праходзіла фарміраванне беларускага народа [18, с. 105–106]. З такім пунктам гледжання не пагадзіліся В.Л. Насевіч і М.Ф. Спірыдонаў, якія на аснове ўважлівага вывучэння масіва крыніц, прыйшлі да высновы, што ў вузкім сэнсе пад тэрмінам Русь у ВКЛ разумеліся Падзвінне і Верхняе Падняпроўе [19, с. 4–27]. З XVII ст., як лічаць А.В. Белы і В.Л. Насевіч, за гэтым рэгіёнам канчаткова замацавалася назва «Белая Русь» [20, с. 306], [21, с. 96]. Сапраўды, пры вывучэнні крыніц, звязаных з падзеямі XVII ст., відавочна, што назвамі «Белая Русь» або проста «Русь» у ВКЛ сучаснікі называлі Полацкае, Віцебскае, Мсціслаўскае і Смаленскае ваяводствы [16, с. 75], [17, с. 2, 6]. Аднак гэты тэрмін мог несці і больш шырокае значэнне. Ужо згаданы раней Ф.К. Абуховіч піша*: «паветы Старадуб, Рэчыца, Мазыр, Пінск, Брэсць і іншых замкаў немала на Белай Русі да шчэнту знішчоны»* [5, с. 20]. У гэтым сэнсе Белая Русь фактычна ахоплівае ўсю літоўскую Русь і ўключае ў сябе як уласна Белую Русь, так і Палессе з літоўскай часткай Севершчыны.

У межах польска-літоўскай Русі ў шырокім сэнсе ў крыніцах сустракаюцца таксама і рэгіянальныя назвы такія як Палессе, Валынь, Падолле, Украіна, [16, с. 97], [17, с. 2, 8]. Пры гэтым трэба ўлічваць, што ў Польскім каралеўстве ў шырокіх межах Русі яшчэ існавала асобнае Рускае ваяводства з цэнтрам у Львове [5, с. 24]. Геаграфічная карціна ўсходняй часткі Рэчы Паспалітай, на наш погляд, удала прадстаўлена ў скарзе рускай шляхты на сойме 1623 г. «*Вільня, Менск, Наваградак (Nowogrod), Гародня, Слонім, Берасце (Brzeście),*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Браслаў, Кобрын, Камянец і іншыя ў Літве. Бельск, Бранск, Драгічын і іншыя на Падляшшы. Пінск, Оўруч, Мазыр і іншыя на Палессі. Уладзімір, Луцк, Крамяцец на Валыні. Львоў, Перамышль, Самбор, Драгабыч, Санок і іншыя ў ваяводстве рускім…. Крычаў, Чачэрск, Прапойск, Рагачоў, Гомель, Остр, Рэчыца, Любеч і іншыя на Панізоўі. Полацк, Віцебск, Мсціслаў, Орша, Магілёў, Дзіснаі іншыя на Белай Русі…»* [22, с. 292].

Асобна трэба адзначыць несупадзенне гісторыка-геаграфічнага тэрміна Ўкраіна з межамі сучаснай дзяржавы з адпаведнай назвай. У XVII ст. пад ***Украінай*** разумелася не ўся тэрыторыя сучаснай Украіны, а хутчэй толькі тэрыторыя Кіеўскага ваяводства. У крыніцах тэрміны «*Валынь, Падолле, Украіна»* звычайна ідуць праз коску як раўназначныя паняцці, якія не паглынаюць адзін адно [15], [5, с. 24–25]. Цікава адзначыць, што ў крыніцах расійскага паходжання час ад часу сустракаўся тэрмін «***Літоўская Украіна»***, які ўбірае ў сябе Белую Русь і літоўскую частку Севершчыны, г.зн. Смаленшчыну і заходнюю Браншчыну ў сучасным разуменні.

Сярод рэгіянальных назваў сустракаецца таксама ***Север*** (Севершчына, Северская зямля), які з'яўляўся даволі абшырным рэгіёнам Русі на ўсходзе Рэчы Паспалітай, які межаваў са Смаленскім ваяводствам ВКЛ і Расійскай дзяржавай [5, с. 3]. Распавядаючы аб тым, што казакі апанавалі ўсёй Чарнігаўшчынай, Старадубшчынай і Ніжнім Пасожжам сучаснік ужывае наступны зварот: «*увесь занялі Север»* [16, с. 117]. Такім чынам, гэты вялізны рэгіён, які зараз знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, Украіны і Расійскай Федэрацыі, пасля Люблінскай уніі аказаўся таксама падзелены на дзве часткі. На заходнюю частку Севершчыны, якая знаходзілася пераважна ў складзе ВКЛ, накладваўся тэрмін ***Панізоўе***, які азначаў тэрыторыі ў Пасожжы і часткова Сярэднім Падняпроўі ад Крычава да Любеча.

Такім чынам, можна заўважыць, што геаграфічная наменклатура XVII ст. істотна адрознівалася ад сучасных аналагаў, а некаторыя тэрміны зніклі з ужытку цалкам. У выніку, на сярэдзіну XVII ст. у Вялікім княстве Літоўскім выдзяляліся наступныя гісторыка-геаграфічныя рэгіёны:

1. Літва – тэрыторыя сучаснай Беларусі ў складзе Гродзенскай вобласці, амаль усёй Мінскай і заходняя і паўночная частка Брэсцкай, заходняя частка Віцебскай абласцей, а таксама ўсходняя частка сучаснай Літвы;
2. (Белая) Русь – Магілёўская, значная частка Віцебскай, усходняя частка Гомельскай абласцей Беларусі, а таксама Смаленская і частка Бранскай абласцей Расійскай Федэрацыі. Пры гэтым з Белай Русі сучаснікі маглі выдзяляць яе паўднёвую частку – Панізоўе і ўсходнюю частку – Літоўскую Ўкраіну.
3. Палессе, якое магло вылучацца асобна, або як складовая частка Русі – усходняя частка Брэсцкай, і заходняя частка Гомельскай абласцей Беларусі і паўночныя рэгіёны Жытомірскай і Валынскай абласцей Украіны;
4. Жэмайція (Жмудзь) – заходняя частка сучаснай Літоўскай Рэспублікі.

Высвятленне значэння гісторыка-геаграфічных назваў неабходна для далейшага карэктнага абазначэння і вывучэння гісторыі тых або іншых тэрыторый сучасных Беларусі і Украіны ў тым сэнсе, які ўкладвалі ў гэтыя тэрміны сучаснікі ў XVII ст.

## Літаратура


1. Akt unii Lubelskej [Electronic resource]. – Mode of access : http:// www.law.uj.edu.pl. – Date of access : 12.08.2013.
2. O Xięstwie Litewskim Przywiliej // Volumina Legum. – Petersburg : Nakładem i drekiem J. Ohryzki, 1859. – T. 2. – S. 87–92.
3. Potwerdzenie Unii mięndzy narodz Polskiemi i Litewskimi, na Seymie walnym Lubelskim, roku 1569 skończoney // Volumina Legum. – Petersburg : Nakładem i drekiem J. Ohryzki, 1859. – T. 2. – S. 92–93.
4. Документы об Освободительной войне украинского народа 1648–1654 гг. – Киев : Наукова думка, 1965. – 825 с.
5. Dyaryusz Kazimierza Filipa Obuchowicza // Pamiętniki historiczne do wyjaśnienia spraw publicznychw Polsce XVII wieku. – Wilno : Nakładem A. Assa Księgarza, 1859. – S. 1–52.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

6. Соловьёв, А.В. Великая, Малая и Белая Русь / А.В. Соловьёв // Вопросы истории. – 1947. – № 7. – С. 24–38.

7. Хрисовул императора Иоанна Кантакузина (август 1347 г.) / И. Мейендорф // Византия и Московская Русь : очерк по истории церковных и культурных связей в XIV в. – Paris : YMCA-PRESS, 1990. – С. 799–802.

8. Черепко, С.А. Православная церковь на Руси XIII–XV вв. : борьба за митрополию / С.А. Черепко // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны : зб. навук. артыкулаў. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2015. – Вып. 4. – С. 14–27.

9. Ермаловіч, М. Па слядах аднаго міфа / М. Ермаловіч. – 2-е выд., дап. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 98 с.

10. Спиридонов, М.Ф. «Литва» и «Русь» в Беларуси в XVI в. / М.Ф. Спиридонов // Наш Радавод. – Гродна : БДМГР, 1996. – Кн. 7. – С. 206–211.

11. Насевіч, В. Літва / В. Насевіч // Беларусы: станаўленне этнасу і нацыянальная ідэя. – Смаленск, 2015. – С. 97–102.

12. Насевіч, В. Да пытання пра саманазву беларусаў у перыяд ВКЛ / В. Насевіч // Беларусы : станаўленне этнасу і нацыянальная ідэя. – Смаленск, 2015. – С. 124–126.

13. Галенчанка, Г.Я. Царква, канфесія і нацыянальная свядомасць беларусаў у XV–XVI стст. / Г.Я. Галенчанка // Наш радавод. – Гродна : БДМГР, 1992. – Кн. 4, ч. 1. – С. 45–48.

14. Галенчанка, Г.Я. Да пытання аб этнічных і этнаканфесійных катэгорыях Вялікага Княства Літоўскага XIV–XVI ст.: «беларусцы», «ліцвіны», і «русіны» ў дыскурсах сучасных даследчыкаў і пісьмовых крыніцах / Г.Я. Галенчанка // Studia Historica Europae Orientalis. – Мінск : Издательский центр БГУ, 2008. – Вып. 1. – С. 9–20.

15. Донесения папского нунция, Иоанна Торреса, архиепископа Адрианапольскаго, о событиях в Польше во время восстания Богдана Хмельницкого. – Киев : Типо-литография М.Т. Мейнандера, 1914. – 181 с.

16. Джерела з історії Національно-визвольної війни українського народу. – Київ : б.в., 2012. – Т. 1. – 670 с.

17. Kojałowicz, W.W. De Rebus Anno 1648 et 1649 contra Zaporovios Cosacos Gestis / W.W. Kojałowicz. – Vilnae : Druk. Akademicka, 1651. – 110 s.

18. Пилипенко, М.Ф. Возникновение Белоруссии : новая концепция / М.Ф. Пилипенко. – Минск : Беларусь, 1991. – 142 с.

19. Насевіч, В.«Русь» у складзе Вялікага княства Літоўскага ў XVI ст. / В. Насевіч, М. Спірыдонаў // З глыбі вякоў. Наш край :гіст.-культуралагічны зб. – Мн. : Беларуская думка, 1996. – Вып. 1. – С. 4–27.

20. Белы, А. Белая Русь / А. Белы // Вялікае княства Літоўскае. Энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : «Беларуская энцыклапедыя», 2005. – Т. 1. – С. 306–308.

21. Насевіч, В. Да пытання пра саманазву беларусаў у перыяд ВКЛ / В. Насевіч // Беларусы : станаўленне этнасу і нацыянальная ідэя. – Смаленск, 2015. – С. 124–126.

22. Документы, объясняющие историю Западно-Русского края и его отношения к России и Польше. – СПб. : въ Тип Э. Праца, 1865. – 658 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 23.03.2018

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ